

На прахадную Мінскага завода пеністых вінаў людзі прыходзілі і патрабавалі прадаць ім акцыі. Усіх ветліва прасілі ісці купляць іх у банкі, але і там не ўсе паспелі атрымаць «кавалачак» прадпрыемства. СТАР. 2



Кожнага аматара выпіць тут ведаюць у твар. Паміж сабой называюць іх нязвыклым словам «сопаўцы». Растлумачваюць: скарочана ад «сацыяльна небяспечны». МС



Геральдычныя сімвалы ўсё часцей сустракаюцца ў гарадскіх ландшафтах, становяцца часткай малых архітэктурных формаў, выкарыстоўваюцца пры афармленні будынкаў, гандлёвых вітрын, грамадскага транспарту. СТАР. 4


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЧЭРВЕНЯ 2012 г. СЕРАДА № 122 (27237) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## УЗАЕМАДЗЕЯННЕ БЕЛАРУСІ І КУБЫ МОЖА ВЫЙСЦІ НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

**Беларусь гатова садзейнічаць Кубе ў пашырэнні яе палітычных, эканамічных і іншых інтарэсаў на еўраазіяцкай прасторы. Такую думку Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў 25 чэрвеня на сустрэчы ў Гаване са старшынёй Дзяржаўнага савета і Савета міністраў Кубы Раулем Кастра Русам.**



Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што пазіцыі Беларусі і Кубы супадаюць па важнейшых пытаннях міжнароднага парадку дня. У першую чаргу гэта датычыцца стварэння шматпалярнага свету і ўстанаўлення справядлівага міжнароднага эканамічнага парадку.

Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама адзначыў, што Беларусь высока цэніць вялікі аўтарытэт Кубы ў Лацінаамерыканскім рэгіёне, сярод дзяржаў, якія сталі на шлях развіцця, у Руху недалучэння.

У Гаване Прэзідэнт Беларусі ўсклаў вянок да манумента Нацыянальнага героя Кубы Хасэ Марці.

Акрамя таго, шэраг сустрэч у Гаване правялі члены беларускай дэлегацыі, якія суправаджалі Прэзідэнта ў яго афіцыйным візіце на Кубу. Па выніках перагавораў падпісаны пакет дакументаў па супрацоўніцтве ў галіне сельскай гаспадаркі, прамысловасці, аховы здароўя, навукі і тэхналогій, якія адкрыюць новыя магчымасці для ўзаемадзеяння дзвюх краін.

У прыватнасці, падпісана міжурадавае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне каранціну і аховы раслін. Падпісанне мемарандумаў аб супрацоўніцтве ў галіне аховы здароўя, сельскай гаспадаркі дасць магчымасць ажыццяўляць пастаўкі новага сельгасабсталявання, частак і дэталяў да яго на Кубу, а ў сферы прамысловасці адкрывае магчымасць ажыццяўлення інвестыцый і мадэрнізацыі вытворчасцяў на Кубе. Акрамя таго, падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхналогій.

Пасля заканчэння сустрэчы лідараў дзвюх краін Рауль Кастра выказаў жаданне асабіста праводзіць кіраўніка беларускай дзяржавы ў аэрапорт. Гэта рашэнне кіраўніка Кубы стала нечаканым, для дыпламатычнай практыкі такое з'яўляецца вялікай рэдкасцю. З Гаваны Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з афіцыйным візітам у Баліварыянскую Рэспубліку Венесуэла.

Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы з Прэзідэнтам Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавесам. У цэнтры ўвагі былі пытанні развіцця гандлёва-эканамічных адносін дзвюх краін, у прыватнасці, рэалізацыя двухбаковых праектаў у розных сферах. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі кола новых напрамкаў супрацоўніцтва.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**



## ШЫРОКА ЎСМІХНІЦЕСЯ: СТАМАТОЛАГІ ІДУЦЬ!

**Дыпломы ўрача-стаматолага ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаны 26 чэрвеня 46 выпускнікам Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.**

**НА ЗДЫМКУ: выпускнікі Віцебскага дзяржаўнага медуніверсітэта — будучыя ўрачы-стаматолагі.**

**Фота БЕЛТА.**



Сяргей НАРЫШКІН:

## «ЕЎРАЗІЙСКІ ПАРЛАМЕНТ ВОЗЬМЕ ЎСЁ ЛЕПШАЕ»

**Афіцыйны візіт расійскай парламенцкай дэлегацыі на чале са спікерам Дзярждумы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Сяргеем Нарышкіным аказаўся надзвычай насычаным. Сустрэча з кіраўнікамі абедзвюх палат беларускага парламента, падпісанне Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Палатай прадстаўнікоў і Дзяржаўнай Думай, сустрэча з прэм'ер-міністрам Беларусі, лекцыя Сяргея Нарышкіна перад слухачамі і выкладчыкамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, пасяджэнне Савета Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, і, нарэшце, пасяджэнне 42 сесіі Парламенцкага Сходу.**

На пленарным пасяджэнні сесіі былі разгледжаны тры буйныя пытанні: справаздача Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы аб выкананні бюджэту Саюзнай дзяржавы за 2010 год, выкананне праграмы Саюзнай дзяржавы «Барацьба са злачыннасцю на тэрыторыі дзяржаў — удзельніц Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на перыяд 2008—2012 гадоў» і дзейнасць Тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі (ТРА) Саюзнай дзяржавы.

Дэпутаты Саюзнага парламента станоўча ацанілі і працу над бюджэтам, і выкананне праграмы па барацьбе са злачыннасцю, і дзейнасць ТРА.

— Мы лічым, што парламенцкае ўзаемадзеянне павінна сыграць сваю ролю ў развіцці супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй, — пракаментаваў вынікі гэтага дня Сяргей Нарышкін. — Мы сёння абмяркоўвалі пытанні, якія датычацца ўмацавання інтэграцыі ў межах Саюзнай дзяржавы, Мытнага Саюза і ЕўрАзЭС. СТАР. 2

## БЕЛАРУСКІЯ АГРАРЫІ ЗМОГУЦЬ ПАЧАЦЬ УБОРКУ ЗБОЖЖАВЫХ НА 1-1,5 ТЫДНЯ РАНЕЙ

**Умовы надвор'я даюць магчымасць беларускім аграрыям сёлета пачаць уборку збожжавых на 1-1,5 тыдня раней. Аб гэтым заявіў учора прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна, дзе разглядаўся ход рэалізацыі рэспубліканскай праграмы «Будаўніцтва новых і мадэрнізацыі дзеючых збожжаачышчальна-сушыльных комплексаў на 2011—2015 гады», перадае БЕЛТА.**

«У адпаведнасці з кліматычнымі ўмовамі чакаецца, што, магчыма, мы пачнём уборку крыху раней — на тыдзень, а можа, і паўтара тыдня раней, чым у мінулыя гады», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. У сувязі з гэтым неабходна накіраваць усе намаганні, каб своечасова падрыхтаваць да работы сушыльныя гаспадаркі і ўвесці ў строй новыя зернесушыльныя комплексы. Адпаведную задачу паставіў і кіраўнік дзяржавы. «Ён асабліва падкрэсліў неабходнасць надаць гэтаму пытанню асаблівую ўвагу, перш за ўсё, аблвыканкамамі. Размова ідзе аб своечасовай і якаснай падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі», — нагадаў прэм'ер-міністр.

Усяго да ўборкі павінна быць уведзена 73 новыя зернесушыльныя комплексы і 23 насеннеачышчальныя лініі. У краіне штогод уводзіцца прыкладна такая ж колькасць гэтых аб'ектаў. «Аднак, як мяне інфармуюць, новыя комплексы ўводзім, а старыя ў парадак не прыводзяцца», — заявіў Міхаіл Мясніковіч. Ён папрасіў звярнуць на гэта пытанне асаблівую ўвагу.

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

29 чэрвеня 2012 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца заключнае пасяджэнне восьмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 18° |
| Віцебск | + 17° |
| Гомель | + 20° |
| Гродна | + 16° |
| Магілёў | + 18° |
| Мінск | + 19° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.06.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8360,00 ▲ |
| Еўра | 10470,00 ▲ |
| Рас. руб. | 252,00 ▲ |
| Укр. грыўня | 1035,17 ▲ |


БЕЛАРУСБАНК 90 лет

С 1 июля по 31 декабря 2012 года — КРЕДИТ ОТ БЕЛАРУСБАНКА НА ПОТРЕБИТЕЛЬСКИЕ НУЖДЫ

«Празднуем вместе»:

- в размере до 200 базовых величин;
- наличными деньгами и безналичным путем;
- под ставку рефинансирования НБ РБ минус три процентных пункта на срок до 18 месяцев;
- без поручителей;
- без комиссий за рассмотрение пакета документов и сопровождение кредита.

ОАО «АСБ Беларусбанк» – 90 лет! Празднуем юбилей вместе!

Информация на сайте www.belarusbank.by и по телефону Контакт-центра – 147

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.


■ На кантролі

## КУРОРТЫ НАРАЧЫ РАЗВІВАЮЦЬ ТУРІНДУСТРЫЮ ПА «ЗЯЛЁНЫХ» ЗАКОНАХ

**Курорты Нарачы развіваюць турындустрыю па «зялёных» законах. Такое меркаванне ўчора, наведваючы Мядзельскі раён, выказаў журналістам першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў, перадае БЕЛТА.**

Інвестуючы ў развіццё курортных зон Нарачанскага краю, дзяржава нацэлена на стварэнне максімальна камфортных умоў для турыстаў. У той жа час не менш увагі надаецца таму, каб захаваць унікальныя запаведныя зоны Нарачанскага краю, адзначыў Аляксандр Радзькоў. У якасці станоўчага прыкладу ён прывёў вопыт Мінаблвыканкама і Мядзельскага райвыканкама, якія для захавання прыродных запаведных ландшафтаў правялі ачышчальныя камунікацыі. СТАР. 2

■ Напярэдадні

## СТАЛІЦУ НА ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ЧАКАЕ «АБНОЎЛЕНЫ» САЛЮТ

**Святочны феерверк пачнецца ў 23 гадзіны і ў Мінску будзе весціся з 6 агнявых пазіцый. Працягнецца ён 10 хвілін. Арганізатары абяцаюць, што мінчане пабачаць новыя залпы, якія да гэтага не прымяняліся.**

Падзеі сталічнага маштабу, прымеркаваныя да Дня Незалежнасці, пачнуцца 28 чэрвеня з адкрыцця мемарыяльнай дошкі ў памяць мастака Міхаіла Савіцкага. Дошка будзе ўсталявана на доме па вуліцы Беламорскай, дзе жыў мастак.Таксама чакаецца адкрыццё каля Палаца спорту кірмашу-выставы народных рамёстваў, які пройдзе 30 чэрвеня і 1 ліпеня. 3 ліпеня на той жа пляцоўцы плануецца канцэрт.

Праграма асноўных мерапрыемстваў застаецца традыцыйнай: ускладанне вянкоў, парад, выкананне Дзяржаўнага гімна, кірмашы і канцэрты, галоўны з якіх — каля стэлы «Мінск — горад-герой». У гэтым годзе, па словах першага намесніка міністра культуры Уладзіміра Карачэўскага, ён будзе «ў фармаце моладзевага шоу з агульнай ідэяй «Моладзь віншуе Беларусь». Акрамя выступленняў артыстаў, плануюцца відэавіншаванні са знакавых месцаў краіны — з Нясвіжа, Маладзечна, Брэста. У месцах масавага святкавання Дня Незалежнасці магчымы дадатковыя пункты пропуску.

— Усё будзе вельмі строга, — адзначыў першы намеснік міністра падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры, — таму, каб своечасова паспець на святкаванне, варта прыйсці загадзя. Праўда, зараз ёсць такая інфармацыя, што магчыма ўвядзенне дадатковых пунктаў пропуску, каб не прымушаць людзей доўга чакаць.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### ЕЎРАКАМІСІЯ ХОЧА АТРЫМАЦЬ ПРАВА КАНТРАЛЯВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ БЮДЖЭТЫ КРАІН ЕЎРОПЫ

Улады Еўрасаюза могуць атрымаць права перапісваць нацыянальныя бюджэты краін-членаў, якія выходзяць за межы максімальна дапушчальных дзярждоўгу і дэфіцыту. Такая прапанова будзе разгледжана на саміце краін ЕС 28-29 чэрвеня, піша The Financial Times. Еўракамісія рыхтуе дэталёвую інструкцыю па прывядзенні ў адпаведнасць з нормамі Еўрасаюза бюджэтаў дзяржаў, якія парушаюць узятыя абавязацельствы. Яе прадпісанні фармальна будуць выглядаць як рэкамендацыі, але за іх невыкананне дзяржаве будзе пагражаць пакаранне аж да буйных штрафаў. Яшчэ адна прапанова — штогадовае калектыўнае зацвярджэнне ўзроўню дзярждоўгу і верхніх межаў бюджэтных расходаў для кожнай краіны еўразоны. Дзяржаве, якая вырашыць павялічыць пазыкі, трэба будзе звяртацца па ўхваленне да астатніх членаў зоны еўра. Узмацненне жорсткасці кантролю за бюджэтным працэсам — крок да фінансавага саюза. Раней афіцыйны Брусель атрымаў права сачыць за бюджэтамі праблемных краін, але не карэктаваць іх.

### ЗНАХОДЗЯЧЫСЯ НА НАГАХ УСЯГО НЕКАЛЬКІ ГАДЗІН НА ДЗЕНЬ, РЭАЛЬНА АБАРАНІЦЦА АД РАКУ

Шпацыруючы кожны дзень па паўтары гадзіны, можна знізіць рызыку раку грудзей на 30%, падлічылі вучоныя. Усяго за тыдзень неабходна хадзіць па 10 гадзін (уключаючы хаджэнне па хатніх справах). Гэтая рэкамендацыя тычыцца ўсіх узроставых груп, падкрэслівае The Daily Mail. Па словах спецыялістаў, падобны рэжым засцерагае ад фарміравання тлушчавай тканкі, звязанай з утварэннем пухлін. Гэта даказаў параўнальны аналіз ладу жыцця 3059 жанчын 20-98 гадоў. Сярод іх у 1504 быў рак грудзей. Так, жанчыны, якія аддавалі ўмеранай фізічнай актыўнасці 10-19 гадзін на тыдзень, на 30% радзей сутыкаліся з ракам грудзей. Як адзначае Ларэн Макалаў з Універсітэта Паўночнай Караліны, каб заставацца здаровым, зусім не абавязкова ісці ў спортклуб. Аднак варта памятаць: тлушчавыя клеткі вызваляюць гармоны накшталт тэстастэрону і эстрагену, якія правакуюць рост пухлін. Раней ужо было даказана, што высокія паказчыкі гэтых гармонаў спалучаныя з 2-3-разовым павышэннем рызыкі раку грудзей у жанчын.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ЛАТВІЯ МОЖА СЫСЦІ З ПРАЕКТА БУДАЎНІЦТВА ВІСАГІНСКАЙ АЭС

Латвія гатовая працягваць перамовы аб партнёрстве ў будаўніцтве Вісагінскай АЭС, але гатовая і сысці, калі яе эканамічныя інтарэсы не будуць улічаны. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Валдзіс Дамброўскіс у інтэрв'ю Латвійскаму радыё.

Па словах Дамброўскіса, важнай умовай удзелу яго краіны ў праекце ВАЭС была і застаецца яго эканамічная выгада для Латвіі. Калі ж краіна яе не ўбачыць, то «мы гатовыя сказаць праекту «не», адзначыў прэм'ер.

Ён паскардзіўся на тое, што Літва не спяшаецца адказваць на шэраг пастаўленых латвійскім бокам пытанняў аб праекце. Таксама Літва не спяшаецца ўзгадняць з патэнцыяльнымі рэгіянальнымі партнёрамі Латвіяй і Эстоніяй праект пагаднення аб канцэсіі са стратэгічным партнёрам будаўніцтва японскай кампаніяй Hitachi, не ўключаючы ў праект важныя для Латвіі пытанні і прасоўваючы дагавор самастойна.

Між тым Літва вырашыла не падпісваць да канца чэрвеня, як планавалася, пагадненне аб канцэсіі з кампаніяй Hitachi, адсунуўшы канчатковае рашэнне на канец бягучага года, у прыватнасці, і для таго, каб быў час абмеркаваць дэталі дагавора з рэгіянальнымі партнёрамі. Партнёрства ў праекце ВАЭС з Латвіяй і Эстоніяй важнае для Літвы, бо, па заяве прэм'ера Літвы Андруса Кубілюса, без іх Літва станцыю будаваць не зможа. Першапачаткова ў праекце планавала прыняць удзел і Польшча, аднак яна выйшла з яго, не ўбачыўшы эканамічнай выгады для сябе.



КОРАТКА

Пошліна на экспарт нафты з Расіі з 1 ліпеня знізіцца на 12% да $369,3 за тону, перадаюць інфармагенцтвы са спасылкай на адпаведнае распараджэнне старшыні расійскага ўрада Дзмітрыя Мядзведзева. Цяпер экспартная пошліна на нафту складае $419,8 за тону.

У Беларусі намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў у студзені—маі 2012 года склала Br3 млн 166,2 тыс., у тым ліку ў маі — Br3 млн 559,6 тыс. і павялічылася ў параўнанні з красавіком 2012 года на 9,4 працэнта, або на Br307 тыс., паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Залаты медаль прывёз з IV Міжнароднага пекінскага балетнага конкурсу харэаграфічных школ малады саліст балетнай трупы Вялікага тэатра Беларусі Канстанцін Геронік, паведамілі ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета. У конкурсе прынялі ўдзел больш як 70 танцоўшчыкаў з розных краін свету.

## ПАД КРЫЛАМІ «БЕРАГІНІ»

**Сёмы раз у раённым цэнтры Акцябрскім прайшоў Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня», арганізатарамі якога сталі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Гомельскі аблвыканкам, Акцябрскі райвыканкам, Гомельскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці, Нацыянальная камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры». Інфармацыйным спонсарам фестывалю зноў стала газета «Звязда».**

Чытачы «Звязды» амаль кожны дзень маюць магчымасць знаёміцца з рэпартажамі пра захаванне і развіццё фальклорнага мастацтва ў розных рэгіёнах Беларусі. Раз у два гады мы паведамляем пра самую яскравую падзею — фестываль «Берагіня», які збірае разам лепшых выканаўцаў народных побытавых танцаў, музыкі, песень, майстроў мастацкіх промыслаў і рамёстваў. СТАР. 6



# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

27 чэрвеня 2012 г.
№ 12 (284)


**ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»**

## Кантроль узмацнілі. Лакальна?

**Пасля публікацыі артыкула «Асфальту мала? Асфальту шмат!»(«МС» за 3.05.12 г.), у якім гаварылася, што ў Віцебску ў моцны дождж укладваюць асфальт, мы атрымалі адказ з Віцебскага гарвыканкама.**

Нагадаю, што «асфальтавую» праблему агучыў наш пастаянны чытач, жыхар Віцебска Мікалай Якаўлевіч Карповіч. Ён заўважыў, як у дождж укладваюць асфальт на вуліцы Глінкі.

«Гэта ж парушэнне тэхналогіі!» — забіў у званы Мікалай Якаўлевіч. І паскардзіўся журналісту, што перад тым, як звярнуцца ў карпункт, настойліва спрабаваў звязацца з гарвыканкамам. А ў выніку на другім канцы провада яму раілі патэлефанаваць па іншых нумарах. Потым журналіст напісаў электроны зварот на імя старшыні Віцебскага гарвыканкама.

Зварот быў разгледжаны з выездам на месца. Як адзначыў намеснік старшыні гарвыканкама, было ўстаноўлена, што спецыялізаванай дарожнай арганізацыяй ДБУ-45 насамрэч выконваліся работы па ўкладцы асфальтабетону ў дажджлівае надвор'е. Работы былі спынены, выкананыя аб'ёмы з акта выкананых работ выключаны. Больш за тое, дзякуючы аператыўнаму рэагаванню рэдакцыі на зварот чытача «прадпрыемствам «Віцебская гарадская жыллёва-камунальная гаспадарка» ўзмоцнены кантроль за выкананнем работ па ўкладцы асфальтабетону падраднымі арганізацыямі».

Чытачы таксама папрасілі ў электронным звароце нагадаць чыноўнікам пра вялікую лужыну па вуліцы Гагарына. Асфальт урэшце там таксама паклалі. «Звычайны цуд» адбыўся не ў май, як паабяцалі ў адказе, а пазней. Ды толькі, можна сказаць, на «хуткую руку» паклалі там асфальт, агрэхі відаць адразу нават неспецыялісту. Шкада, што за якасцю выкананых работ у гэтым месцы сачылі няўважліва. Адназначна, кантроль за якасцю рамонту дарог трэба ўзмацніць паўсюдна, а не толькі ў месцах, дзе праводзяцца афіцыйныя мерапрыемствы. Або па-ранейшаму будзе, як у той, першай публікацыі: «Асфальту мала? Асфальту шмат!»

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# КУДЫ ГЛЯДЗІЦЬ АГЛЯДНАЯ КАМІСІЯ

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**



Сёння ў складзе агляднай камісіі інспектар энерганагляду Уладзімір ТРАЯНАЎ, загадчыца ФАПа Людміла ЖАУНОВА, старшыня ЖГУНСКАГА сельскага Савета Валянціна КІРЫЕНКА і дырэктар школы Валянціна ДЗЯМ'ЯНАВА.

**— Бульбу акучылі ўжо? Ці многа «каларадаў»? — Гэта самае першае, пра што пытаецца старшыня Жгунскага сельскага Савета Добрушскага раёна Валянціна Кірыенка ў бабулькі, да якой мы прыйшлі ў складзе агляднай камісіі. Пенсіянерка Надзея Цімафееўна Шабаліна толькі на хвіліну забегла ў дом з агарода, каб перакусіць, а тут госці! Тым не менш нас яна сустракае з усмешкай, як самых родных.**

**— Праходзьце, глядзіце што трэба, правярайце ўсё, — ветліва запрашае ў дом.**



Пенсіянерка Надзея Мікалаеўна ЧАРНОВА.

### Апавяшчальнік для бабулі

Сталая жанчына жыве адна, таму ўваходзіць у спіс тых, да каго ўвага — асаблівая. Ёй раней быў усталяваны супрацьпажарны апавяшчальнік, і таму члены камісіі (яны ж аднавяскоўцы) цікавяцца: ці ўсё добра?

— Ой, ён жа, аказваецца, крыху пабліскае. Я не ведала, мне ўнучка, калі гасцявала, пра гэта сказала.

— Тое, што пабліскае — гэта добра. Значыць спраўны. Самае галоўнае, каб не вішчаў, як рэзаны, — тлумачыць старшыня сельскага Савета.

— А, калі, не давядзі Бог, завішчыць, значыць, дзесьці штосьці загарэлася. Тады хутчэй на вуліцу і тэлефануйце 101, — інспектар Добрушскай раённай інспекцыі энерганагляду Уладзімір Траянаў нагадвае Надзеі Цімафееўне тое, што яна быццам і ведае, але ж лепш паўтарыць, небеспадстаўна лічыць ён. Кожны чалавек у экстрэмальных сітуацыях губляецца, тым больш сталы!

Разам з кіраўніком сельсавета яны ўзгадваюць выпадак (не адзін!), як пенсіянеркі пры спрацоўванні апавяшчальніка перапужаліся і паспрабавалі яго сарваць, а потым яшчэ тапілі прыбор у вядры з вадой. На шчасце, усё абышлося.

— Калі людзі паміраюць, я прашу сваякоў, каб яны здалі нам на накладной апавяшчальнікі, пастаўленыя за кошт дзяржавы, — адзначае Валянціна Кірыенка. — Нам жа ёсць куды іх паставіць, і фінансавых выдаткаў менш. Бывае і інакш. Дзеці жывуць у горадзе, а маці — тут. Мы пішам ліст дзецям: "Паважаны Іван Іванавіч! У мэтах захавання жыцця вашай матулі рэкамендуем купіць ёй пажарны апавяшчальнік". Гэта таксама дзейнічае, і прыбор купляюць.

Абавязкова правярае камісія і стан электрычнай праводкі — тым больш што састарэлых пабудоў у Жгуні і асабліва ў Жгунскай Будзе (якая таксама ўваходзіць у склад сельсавета) дастаткова.

— Нам з раённага бюджэту сёлета выдаткавана 25 млн рублёў — не толькі для ўстаноўкі аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў, але і для рамонту пячнога ацяплення і электраправодкі. 150 апавяшчальнікаў ужо ўстанавілі — на 11 мільёнаў рублёў. А вось печку адрамантаваць каштуе вельмі дорага — не менш за 3 мільёны абыдзецца, — уздыхае Валянціна Кірыенка. Усім, каму трэба, за гэтыя грошы не адрамантуеш. Добра, што ў абодвух населеных пунктах праведзены прыродны газ і многія проста не карыстаюцца пячным ацяпленнем.

Сапраўды, 76-гадовая Надзея Мікалаеўна Чарнова, у якой няма сваякоў, карыстаецца толькі прыродным газам — і для гатавання ежы, і для ацяплення.

— Прывыкла — і зручна. Адной, безумоўна, цяжка. Але ж кароўку трымаю яшчэ — а як жа без карміцелькі? І курэй у мяне процьма. І зямлі больш за 30 сотак. Усё, што мне патрэбна, ёсць калі не ў краме, дык на гародзе. Вось сёлета два вядры клубніц ужо зварыла, — расказвае жанчына аб сваіх штодзённых клопатах.

Гаворка гаворкай, аднак пільны погляд інспектара энерганагляду Уладзіміра Траянава спыняецца на электраправодцы на верандзе:

— Трэба замяніць, — кажа. — Быццам бы і не катастрафічная сітуацыя, але ж няхай лепш спецыялісты зробяць як трэба.

Старшыня сельскага Савета ўсё фіксуе ў адпаведных паперах, а мы накіроўваемся далей.

### «Сопаўцы» і «дэкрэтчыкі»

Пакуль крочым па добраўпарадкаваных вуліцах аграгарадка Жгунь, Валянціна Кірыенка расказвае:

— На нашай тэрыторыі жывуць 1772 чалавекі. Наведваем мы самыя розныя катэгорыі людзей. І асабліва часта, безумоўна, тых, хто ўваходзіць у групы рызыкі...

Пра такіх, дарэчы, размова асобная. Кожнага аматара выпіць тут ведаюць у твар. Паміж сабой называюць іх нязвыклым словам «сопаўцы». Растлумачваюць: скарочана ад «сацыяльна небяспечны».

— У нас такіх 5 сем'яў, — адзначае Валянціна Кірыенка. — Яны знаходзяцца пад пастаянным кантролем не толькі агляднай камісіі, але і школы, міліцыі... Усе дарослыя працуюць, але на ўліку ў нас стаяць, праводзім з імі прафілактычныя гутаркі. Таксама да нас прыязджаюць супрацоўнікі пракуратуры. «Дэкрэтчыкаў» (так тут называюць грамадзян, якія выплачваюць грошы за ўтрыманне сваіх дзяцей, якіх выхоўвае дзяржава адпаведна з дэкрэтам № 18) у нас 6 чалавек засталося. Раней было 12, але палова ўжо выплаціла свае запазычанасці.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**



Уладзімір ТРАЯНАЎ правярае электраправодку.

**ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ**

## Пакрыўдзіліся... на старэйшыну

**Ліст Таісіі Сяргееўны Руткоўскай, жыхаркі вёскі Папкі Шаркаўшчынскага раёна, які днямі прыйшоў у рэдакцыю, быў пра вясковае жыццё, пра стаўленне да зямлі і пра чалавечыя стасункі.**

«Ведаем, што дрэннай зямлі не бывае. Як ты яе апрацуеш, так яна табе і аддзячыць. Самі працаваць любім і дзяцей сваіх вучым, вопыт перадаём. Радуемся за тых, хто трымае свае ўчасткі ў чысціні, наводзіць парадак на агародах... Але ж людзі бываюць усялякія, як і іх зямельныя надзелы».

Ёсць участкі, што зарастаюць бур'яном, — ад іх у свой час адмовіліся гаспадары. Менавіта з-за такога ўчастка і ўзніклі непаразуменні, якія прымусілі Таісію Сяргееўну звярнуцца ў рэдакцыю. Летась, паведамляе спадарыня Руткоўская, аднавясковец адмовіўся ад свайго агарода. Адмовіўся і адмовіўся — яго справа. Муж Таісіі Сяргееўны пацішу-памалу пачаў гэты «нічыйны» ўчастак у парадак прыводзіць: спачатку пакасіў, прыбраў пустазелле, а сёлета падкарміў і засеяў травой. Засталося толькі чакаць ураджай... Але, прыйшоўшы аднойчы на ўчастак, які Руткоўскія ўжо лічылі амаль што сваім, яны са здзіўленнем убачылі там чужую свойскую жывёлу, якая мірна пасвілася, пашчыпваючы траву. Здзіўленне Руткоўскіх хутка перарасло ў абурэнне, калі высветлілася, што жывёла належыць не каму-небудзь, а... старэйшыне вёскі Галіне Апалька, якая па вызначэнні павінна сачыць за агульным парадкам, але ніяк не парушаць яго!.. Пакрыўджаныя вяскоўцы патэлефанавалі ў Германавіцкі сельскі Савет — старшыні Алене Альбертаўне Рубін, папрасілі разабрацца. Праз некаторы час кіраўнік сельсавета сама завітала да Руткоўскіх з прадстаўніком землеўпарадкавальнай службы і паабяцала, што на азначаным участку больш ніхто сваю жывёлу навязваць не будзе. Але Руткоўскім — калі яны маюць намер узяць зямлю ў карыстанне — давядзецца заплаціць за адвод участка (крыху больш за 200 тыс. рублёў).

Таісія Сяргееўна Руткоўская папрасіла рэдакцыю разабрацца: ці сапраўды неабходна нешта плаціць за ўчастак, які яны з мужам давялі да ладу? Таксама нашу чытачку цікавіць, якія правы і абавязкі мае старэйшына населенага пункта. Няўжо ёсць закон, які дазваляе старэйшынам не лічыцца з інтарэсамі аднавяскоўцаў?

— У прынцыпе, як такой праблемы з Руткоўскімі сёння ўжо няма, — патлумачыла нам старшыня Германавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Алена Рубін. — Ад участка, пра які ідзе гаворка, ранейшы гаспадар адмовіўся. А Руткоўскі спачатку апрацоўваў гэтую зямлю і толькі потым падаў у сельвыканкам заяву, каб узяць яе ў карыстанне афіцыйна. Мы далі яму неабходныя тлумачэнні і адправілі яго заяву ў землеўпарадкавальную службу. Там ужо прынялі станоўчае рашэнне, засталося зацвердзіць яго ў нашым райвыканкаме. Пасля гэтага за адвод участка новым гаспадарам — Руткоўскім — давядзецца заплаціць фіксаваную стаўку, вызначаную законам. Яны ўжо азнаёмлены з гэтымі ўмовамі і нічога супраць іх не маюць.

З прэтэнзіямі ў адрас старэйшыны вёскі Галіны Апалька (маўляў, дрэнна спраўляецца са сваімі абавязкамі) кіраўнік сельсавета Алена Рубін не згодна.

— Мы з Галінай Леанідаўнай нармальна супрацоўнічаем, заўсёды знаходзім паразуменне. Яна дапамагае мясцовай уладзе як можа, нічога дрэннага сказаць пра яе не магу. Прычым за сімвалічнае заахвочванне, лічыце, на грамадскіх пачатках сочыць за парадкам. Заўсёды тэлефануе, калі бачыць, што нехта парушае агульнапрынятыя нормы. Скажам, адна мясцовая жыхарка завяла каўказскіх пчол, а для іх утрымання патрэбны пэўныя ўмовы: аддаленасць ад жылля або наяўнасць высокай агароджы на ўчастку... Ні першага, ні другога гаспадыня не забяспечыла. Вяскоўцы паскардзіліся старэйшыне, яна — мне... У выніку давялося пагутарыць з гаспадыняй пчол, і яна пагадзілася, што ім у вёсцы не месца. Шмат праблем у нас з бадзяжнымі сабакамі — але ж не сама старэйшына павінна іх адстрэльваць. Рэгулярна тэлефануем у раённую службу ЖКГ, якая займаецца гэтым пытаннем па меры магчымасцяў. А ўвогуле, усім людзям дагадзіць цяжка, калі аднаму будзеш добрым, іншаму — не, — уздыхае Алена Альбертаўна.

...Хацелася б, безумоўна, каб першых было больш. Жыццё ж у вёсцы спрэс навідавоку. На адным канцы чхнеш — на другім пачуюць. І абавязкова абмяркуюць. Бо так ужо склалася спакон веку: радасці і беды ў жыхароў невялікага населенага пункта былі агульныя, а інакш немагчыма і выжыць. Як той казаў, да Бога высока, да цара — далёка... Па сутнасці, у гэтым сэнсе мала што змянілася. І сёння сіла невялічкай вёскі і яе жыхароў — у еднасці, згуртаванасці, узаемадапамозе і ўзаемапавазе. Незалежна ад таго, хто ты — старэйшына ці «шараговы» вясковец. І пакуль будзе існаваць гэтая еднасць і ўзаемапавага (а не наадварот!) — будзе жыць і вёска. Нават самая маленькая...

**Наталля КАРПЕНКА.**

*Па просьбе Таісіі Сяргееўны Руткоўскай змяшчаем ніжэй вытрымкі з «Палажэння аб старэйшынах населеных пунктаў», распрацаванага для Віцебскай вобласці.*

### Палажэнне аб старэйшынах населеных пунктаў

**Старэйшына выступае злучальным звяном паміж насельніцтвам вёскі і органамі мясцовага кіравання і самакіравання, садзейнічае развіццю ініцыятывы грамадскасці і шырокаму прыцягненню грамадзян да рашэння пытанняў мясцовага значэння, зыходзячы з інтарэсаў дзяржавы і інтарэсаў насельніцтва, якое пражывае на адпаведнай тэрыторыі.**

**Асноўныя паўнамоцтвы старэйшыны:**

* ...Старэйшына садзейнічае ажыццяўленню палітыкі, ідэалогіі беларускай дзяржавы, рашэнняў мясцовага Савета дэпутатаў, выканкама, а таксама арганізуе выкананне рашэнняў сходаў грамадзян;

* вядзе работу па захаванні законнасці, прадухіленні парушэнняў грамадскага парадку, працоўнай дысцыпліны, пажарнай бяспекі, па прафілактыцы і папярэджванні злачынстваў і правапарушэнняў, п'янства і алкагалізму, маральнай разбэшчанасці;

* здзяйсняе агульны кантроль за дзейнасцю службаў, якія аказваюць паслугі сельскаму насельніцтву, уносіць прапановы ў адпаведныя органы па ўдасканаленні іх працы;

* склікае сходы жыхароў населенага пункта; забяспечвае кантроль за рэалізацыяй прынятых рашэнняў, дакладвае насельніцтву пра становішча спраў у населеным пункце;

* аказвае дапамогу сельскаму Савету дэпутатаў, выканаўчаму камітэту, органам тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, грамадскім арганізацыям у правядзенні грамадскіх, культурна-масавых і гаспадарчых мерапрыемстваў. Садзейнічае дэпутатам Саветаў усіх узроўняў у здзяйсненні сваіх паўнамоцтваў;

* арганізуе ўдзел насельніцтва ў рабоце па добраўпарадкаванні і паляпшэнні санітарнага стану населеных пунктаў, паркаў, сквераў, могілак, брацкіх магіл, помнікаў гісторыі і культуры;

* садзейнічае развіццю ўласных падсобных гаспадарак грамадзян. Разам з выканкамам, службовымі асобамі сельгаспрадпрыемстваў праводзіць пастаянную арганізатарскую работу па продажы насельніцтву маладняку жывёлы і птушкі, забеспячэнні кармамі, закупе лішкаў сельгаспрадукцыі;

* аказвае дапамогу ў арганізацыі работы медыцынскіх і культурна-асветніцкіх устаноў, аб'ектаў камунальна-бытавога прызначэння, магазінаў, прадпрыемстваў грамадскага харчавання, дабіваецца наяўнасці ў гандлёвай сетцы тавараў першай неабходнасці, пашырэння відаў і павышэння якасці работ і паслуг;

* удзельнічае ў арганізацыі спаборніцтва паміж жыхарамі вёсак за ўзорны парадак і культуру побыту, у правядзенні свят вуліц, вёсак;

* клапоціцца пра паляпшэнне матэрыяльных і бытавых умоў інвалідаў, сем'яў загінулых, удзельнікаў вайны, састарэлых грамадзян;

* разглядае звароты грамадзян, прымае меры па іх выкананні.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

## Парламентарыі заклапочаны станам прыроды

**У Брэсце адбылося пасяджэнне семінара, які пастаянна дзейнічае пры Парламенцкім сходзе, па пытаннях будаўніцтва Саюзнай дзяржавы на тэму «Практыка, праблемы і перспектывы асабліва ахоўваемых тэрыторый Беларусі і Расіі». У абмеркаванні ўдзельнічалі не толькі дэпутаты Парламенцкага сходу, але і прадстаўнікі прыродаахоўных ведамстваў, кіраўнікі запаведнікаў і заказнікаў, навукоўцы дзвюх краін. Асаблівая ўвага нададзена перспектывам развіцця запаведных тэрыторый.**

Брэстчына нездарма была выбрана месцам для такога форуму — 14% тэрыторыі вобласці займаюць тэрыторыі, якія асабліва ахоўваюцца, ёсць 17 заказнікаў рэспубліканскага і 27 — мясцовага значэння. У рэгіёне 22 старадаўнія паркі, дзе растуць вельмі рэдкія віды дрэў. Цар-дуб у Маларыцкім раёне прастаяў ужо 800 гадоў, а асобныя сосны ў Белавежскай пушчы хутка дасягнуць 500-гадовага ўзросту. Дарэчы, удзельнікі семінара наведалі Белавежскую пушчу, дзе азнаёміліся з вопытам работы па захаванні і падтрыманні ў натуральным стане біялагічных сістэм унікальнага лесу.

Парламентарыі рэкамендавалі максімальна пашыраць і выкарыстоўваць патэнцыял партнёрства запаведнікаў і нацыянальных паркаў Беларусі і Расіі, адобрылі вопыт распрацоўкі планаў кіравання такімі тэрыторыямі ў нашай краіне і прапанавалі яго для Расіі. Паводле меркавання дэпутатаў Парламенцкага сходу, настаў час для стварэння трансгранічных прыродных тэрыторый, якія ахоўваюцца, на базе памежных заказнікаў і нацыянальных паркаў і сумесных праграм па захаванні рэдкіх і знікальных відаў раслін і жывёл.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**ПРЫЁМНАЯ ДЭПУТАТА**

# ПАНЯДЗЕЛАК — ДЗЕНЬ АДКАЗНЫ



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Рашэннем прэзідыума Мінскага гарадскога Савета ўсталяваны адзіны дзень прыёму дэпутатамі сваіх выбаршчыкаў — першы панядзелак кожнага месяца. Акрамя гэтага, усе дэпутаты прымаюць грамадзян у сваіх выбарчых акругах дадаткова другі, а некаторыя і трэці раз на месяц. Як у каго атрымліваецца. Але сустрэчы па панядзелках — строгі абавязак, які не падлягае перагляду.**

Дарэчы, і старшыня Мінскага гарсавета Міхаіл Савановіч як дэпутат кожны першы панядзелак месяца вядзе прыём грамадзян у сваёй выбарчай акрузе ў Фрунзенскім раёне. А як старшыня Савета прымае мінчан у сваім службовым кабінеце. Прычым не толькі па серадах, як прадугледжана графікам, але практычна ў любы дзень пры ўмове знаходжання на працоўным месцы.

— Людзі звяртаюцца да дэпутатаў па розных пытаннях. З пачатку тэрміна 26-га склікання ў гарсавет на маё імя паступіла больш за 100 пісьмовых зваротаў. Часцей за ўсё просяць дапамагчы ў вырашэнні жыллёвых праблем, капітальным рамонце дамоў і кватэр. Ёсць на першы погляд дробныя, але важныя для канкрэтнага чалавека праблемы: напрыклад, адсутнасць камер захоўвання ў гандлёвым цэнтры, асвятленне Алеі маладых па вул. Галадзеда, пляцоўкі для выгулу сваіх жывёл і г.д. Апошнім часам выбаршчыкі звяртаюцца па даходлівае тлумачэнне парадку выплаты мясцовых падаткаў і збораў, з іншымі «нетыповымі» пытаннямі. Такія просьбы таксама разглядаюцца сумесна са службамі гарвыканкама, раённымі адміністрацыямі, і ўсе заяўнікі атрымліваюць адказы ў вызначаныя тэрміны, — гаворыць Міхаіл Савановіч.

Вядома, дэпутату трэба і выслухаць чалавека і, што самае галоўнае, дапамагчы. Адны пытанні здымаюцца хутка, іншыя патрабуюць уважлівага вывучэння. Апошнія знаходзяцца на асаблівым кантролі. Амаль два гады назад гарсавет прыняў рашэнне, у якім зацверджаны комплекс захадаў па рэалізацыі 336(!) праблемных пытанняў і наказаў. Найбольшая колькасць (43%) зваротаў датычылася работы службаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, арганізацыі парковак. Пытанні будаўніцтва жылля, рамонту, зносу, адсялення складаюць 15%, транспартнага забеспячэння, у тым ліку рамонту альбо будаўніцтва аб'ектаў транспартнай інфраструктуры — 14%.

Значная частка такіх пытанняў і наказаў (36%) патрабуе дадатковых фінансавых сродкаў для рэалізацыі. Пры гэтым рэалізацыя такіх наказаў мінчан, як рэканструкцыя і будаўніцтва ўстаноў адукацыі, аховы здароўя, сацыяльна-культурнай сферы, транспартнай інфраструктуры горада ў прынцыпе немагчымая без цеснага ўзаемадзеяння з выканаўчай уладай: гарвыканкамам і раённымі адміністрацыямі.

Ёсць скаргі (іх нямала) неабгрунтаваныя, як той казаў, высмактаныя з пальца, напісаныя пад уплывам неправераных чутак. Скажам, дэпутат гарадскога Савета Дзмітрый Шаўцоў атрымаў пісьмо ад жыхароў аднаго з дамоў па вуліцы Багдановіча. Людзі пісалі, што пры правядзенні капітальнага рамонту будынка былі высечаны дрэвы, і на іх месцы створаны паркоўкі для аўтамабіляў жыхароў мікрараёна. Пры праверцы аказалася, што ўладкаванне паркоўкі адбылося на законных падставах у адпаведнасці з праектна-каштарыснай дакументацыяй. Пра гэта аўтарам звароту паведамілі на іх сустрэчы з прадстаўнікамі службаў адміністрацыі раёна (ЖРЭА, ЖЭС, ДАІ, супрацоўнікамі аддзела архітэктуры, кіраўніцтвам падраднай арганізацыі). У выніку дыскусіі бакі прыйшлі да агульнай думкі, што стварэнне такіх парковак усё ж павінна развівацца ва ўнутраных дваровых тэрыторыях, бо рост колькасці аўтамабіляў у гараджан перавышае агульны рост створаных аўтастаянак. Да таго ж, наяўнасць парковак прадухіляе пашкоджанне зялёных зон.

Але нярэдка пратэсты мінчан з нагоды так званага ўшчыльнення гарадской тэрыторыі пад узвядзенне новых камерцыйных забудоў вырашаюцца на карысць абураных людзей. У сваім калектыўным звароце жыхары шэрагу дамоў па вул. Куйбышава і Сурганава выступілі супраць будаўніцтва шматпавярховага жылога дома з падземнымі гаражамі. Дэпутат гарадскога Савета арганізаваў сустрэчу жыхароў квартала з прадстаўнікамі фірмы-забудоўшчыка і адміністрацыі Савецкага раёна. На сустрэчы жыхары казалі, што будаўніцтва новага аб'екта шляхам ушчыльнення прывядзе да ліквідацыі зялёнай зоны, да яшчэ большага перапаўнення дзіцячых садкоў і школ... Пасля сустрэчы было арганізавана ананімнае анкетаванне грамадзян, падрыхтаваны ліст на імя старшыні Мінгарвыканкама. Звесткі анкетавання былі разгледжаны ў адміністрацыі раёна. Вынік — забудоўшчыку было адмоўлена ў будаўніцтве новага дома.

Добра, калі зварот абгрунтаваны, а калі не? У сувязі з гэтым у гарсавеце вялікія надзеі ўскладаюць на далейшае развіццё тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (ТГС). Дзякуючы яму гараджане маюць магчымасць самастойна вырашаць розныя пытанні мясцовага значэння. І не толькі. Тэрытарыяльнае самакіраванне — гэта работа з дзецьмі і падлеткамі па месцы жыхарства, падрыхтоўка і правядзенне грамадска-палітычных, фізкультурна-аздараўленчых, культурна-масавых мерапрыемстваў і іншае.

Для таго, каб мінчане больш актыўна далучаліся да гэтай грамадскай дзейнасці, гарсавет штогод праводзіць у жніўні агляд-конкурс сярод органаў тэрытарыяльнага самакіравання. Заснаваны шэсць прызавых месцаў, па выніках конкурсу пераможцы заахвочваюцца грашовымі прэміямі. Дарэчы, палову гэтых сродкаў прызёры накіроўваюць на развіццё мясцовага ТГС, астатнія грошы — на заахвочванне яго актывістаў.

— Мы імкнёмся абавязкова ўлічваць, што людзі ў ТГС працуюць на грамадскіх пачатках, у вольны ад асноўнага занятку час, што эфектыўнасць іх дзейнасці на мясцовым узроўні ў многім залежыць ад падтрымкі гарадскіх уладаў — у першую чаргу інфармацыйна-метадычнай і арганізацыйнай: прадастаўлення памяшканняў, тэхнічных і матэрыяльных сродкаў, — кажа старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Ён заўважае, што ў многім дзякуючы настойлівасці дэпутатаў па рэалізацыі наказаў выбаршчыкаў Мінгарсаветам прыняты шэраг важных для жыхароў горада рашэнняў. Адно з іх — аб стварэнні безбар'ернага асяроддзя для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. На гэту тэму, дарэчы, быў зварот ад жыхара дома № 72 па вул. Пружынскіх: ён патрабаваў паскорыць будаўніцтва пандуса. Дзеля вырашэння такіх наказаў і зваротаў у комплексе была распрацавана гарадская праграма па фарміраванні камфортнага асяроддзя жыццядзейнасці для інвалідаў і іншых фізічна аслабленых асоб на 2011—2015 гг. Дзякуючы гэтаму дакументу ўсе праекты шматкватэрных жылых дамоў маюць абсталяваныя паводле нормаў забеспячэння безбар'ернага асяроддзя ўваходы ў пад'езды. Пры будаўніцтве кватэр для інвалідаў прадугледжана павелічэнне дзвярных праёмаў у санвузлы, кухні, жылыя пакоі, выхады на балконы і лоджыі. Ужо ўсталёўваюцца дамафоны са светлавым або іншым візуальным сігналам.

Мінскі гарсавет заўсёды адкрыты для размовы з выбаршчыкамі. Толькі дэпутатам хочацца, каб людзі да іх звярталіся па сапраўды значных пытаннях, а звароты суадносіліся з рэальнымі магчымасцямі мясцовай улады.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# КУДЫ ГЛЯДЗІЦЬ АГЛЯДНАЯ КАМІСІЯ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Раз у год такіх выклікаюць у раён і паказваюць ім на вялікім экране кіно, знятае тады, калі яны былі п'янымі. Гэта ж якая ганьба! Некаторыя пасля такога «кінадэбюту» задумваюцца пра сваё далейшае жыццё і згаджаюцца закадзіравацца. У нас Людміла Новікава была пазбаўлена бацькоўскіх правоў. Пастаянна прыходзіла сюды, плакала і абяцала, што не будзе больш піць, але зрывалася зноў і зноў. Тады ў яе адабралі дзіця. Пры гэтым прапанавалі ўладкавацца ў гаспадарку даяркай. Яна не хацела, бо не ўмела кароў даіць. Потым усё ж згадзілася. Праз пэўны час мне кажуць: «Люда працуе добра. І даглядае кароў як трэба». Пытаюся ў яе: ці падабаецца? Адказвае: «Раней баялася, а цяпер сапраўды падабаецца». Гаспадарка ёй выдзеліла кватэру, дзе яна і жыве з дзіцем, якое вярнулі.

Аднак не ўсе прыклады такія станоўчыя. Валянціна Лявонаўна кажа, што большыя праблемы дастаўляюць не мясцовыя, а прыезджыя алкаголікі. Толькі ў Жгунскім сельсавеце некалькі сумніўных асоб з'явілася па адным сцэнарыі: у Гомелі прадалі свае кватэры пасрэднікам, а тыя ім на вёсцы хаткі купілі:

— Вось яны і бамжуюць тут. Мы іх пастаянна «дастаём», але ж калі людзі сябе страцілі, ім ужо ўсё роўна, хто і аб чым з імі гутарыць. У тым ліку супрацоўнікі РАУС, якія працуюць з імі пастаянна — у тым ліку накіроўваюць ў лячэбна-працоўны прафілакторый.


Шматдзетная маці Алена БЫКАВА пагутарыла з дырэктарам школы Валянцінай ДЗЯМ'ЯНАВАЙ і старшынёй Жгунскага сельсавета Валянцінай КІРЫЕНКА.

## У цеснаце, ды не ў крыўдзе

Яшчэ адна вясковая традыцыя высвятляецца па дарозе ў шматдзетную сям'ю супрацоўніцы комплекснага прыёмнага пункта Наталлі Бардоўскай, якая лічыцца маці-адзіночкай. У яе трое дзяцей, а шлюбныя адносіны афіцыйна не зарэгістраваны. Так дапамога атрымліваецца большая, лічаць многія мясцовыя жанчыны. У калідоры кватэры — вялізны чамадан. Ён сабраны для малодшай, 10-гадовай Ангеліны. Маленькая вандроўніца з групай накіроўваецца ў Іспанію. Дарэчы, трэці раз. Старэйшы сын вучыцца ў ПТВ на зваршчыка, а малодшы закончыў 8 класаў, збіраецца ў 9-ты. Дырэктар Жгунскай сярэдняй школы Валянціна Дзям'янава, якая таксама ўваходзіць у склад агляднай камісіі, спрабуе пераканаць матулю, каб хлопца, які адназначна не будзе пасля школы прэтэндаваць на атрыманне вышэйшай адукацыі, ужо зараз аддалі вучыцца ў ПТВ. Аднак маці непахісная. Яна лічыць, што 15-гадовы падлетак можа падпасці пад негатыўны ўплыў аднагодкаў:

— Асяроддзе ў школе больш станоўчае, чым у ПТВ, а прафесію ён атрымае і потым, пасля заканчэння 11 класаў, — упэўнена Наталля.

Тым часам Уладзімір Траянаў, як звычайна, праверыў лічыльнікі і электраправодку і кліча да сябе хлопцаў. Падрабязна, з прыкладамі, расказвае юнакам пра правілы паводзін падчас рыбалкі і купання. Асабліва звяртае ўвагу на выпадкі, калі рыбу ловяць пад лініямі электраперадач:

— Спінінг хлопец закідваў — нават не дакрануўся да правадоў, але ж узнікла электрычная «дуга», і чалавек атрымаў моцныя апёкі.

Каб было яшчэ больш зразумела, усім членам сям'і Уладзімір Міхайлавіч раздае прыгожыя закладкі для кніг, на якіх змешчаны правілы электрабяспекі.

## Падарунак ад сельсавета

Па дарозе маю ўвагу міжволі прыцягвае вялізны прыгожы дом, які літаральна патанае ў кветках. Па плане мы не павінны сюды заходзіць, але ж Валянціна Лявонаўна мяняе маршрут:

— Тут жыве мой самы галоўны памочнік, старэйшына нашай вёскі, былы дырэктар племзавода «Жгунскі» Леанід Радкевіч. Яго ўсе ведаюць не толькі ў раёне, але і ў вобласці. Дарэчы, ён сёння юбіляр!

Ну і паспрабуй пасля такой рэкамендацыі не павіншаваць чалавека, які і цяпер усю кіпучую энергію накіроўвае на добрыя справы для сваёй вёскі. Напрыклад, «прабіў» ідэю стварэння ў Жгуні Дома народных рамёстваў. Вырабы Мікалая Ляшкова, які тут цяпер дзяцей вучыць разьбе па дрэве, прыцягваюць увагу не толькі аднавяскоўцаў...

У сям'і Паўленкаў, куды мы трапляем, — трое дзяцей. Але ж старэйшы хлопец (18-гадовы) паспеў ужо ажаніцца, і цяпер тут чакаюць унука. Маці працуе ў школе, бацька — у гаспадарцы.

— Сярэдняму, Сяргею, зараз 16 гадоў, ён вучыцца ў ПТВ і ў вольны час прыходзіць у сельвыканкам падпрацоўваць. Сёння будзе з сябрам газонакасілкамі касіць пустазелле. Нам карысць, і ён нейкі невялікі заробак атрымае. Я сваіх памочнікаў не забываю — на школьнай лінейцы кожны, хто дапамагаў летам сельсавету, абавязкова атрымае падарунак (хоць і невялікі) і слова ўдзячнасці, — кажа старшыня сельскага Савета.

Пакуль знаёмімся з сям'ёй (у тым ліку з катамі і шматлікімі кацянятамі), інспектар энерганагляду звяртае ўвагу на печку, ад якой адвалілася плітка. Гаспадар адразу ж адказвае, што за лета абавязкова зробіць рамонт. Валянціна Лявонаўна ўдакладняе тэрміны і ўсё заносіць у адмысловы акт.

## Для каго — норма, для каго — не

У апошнім доме, куды трымае шлях назіральная камісія Жгунскага сельсавета, жыве сям'я Быкавых. У Алены і Валерыя пяцёра дзяцей. Бацька працуе механізатарам, маці — поварам у сталовай мясцовай гаспадаркі. Старэйшы сын ужо служыць у арміі, двое сярэдніх зараз у замежным адпачынку знаходзяцца.

— Алена ў Італіі, Мікіта — у Германіі, — расказвае матуля, — са мной толькі самыя маленькія. Новы дом нам выдзеліла нядаўна гаспадарка. Пакояў шмат, хаця нам, калі разам збяромся, усё роўна цеснавата.

Пытанняў у членаў камісіі няма, гутарка ідзе пра спрадвечныя вясковыя справы.

— Са сваімі, мясцовымі, лягчэй, а вось прыезджыя патрабаванні не адразу разумеюць, — уздыхае старшыня сельскага Савета. — Да нас прыехала нядаўна сям'я з Расіі. Афіцыйна зарэгістравалася толькі адна жанчына, але ж потым і дзеці з бацькамі прыехалі. Мы з дырэктарам школы прыйшлі і цікавімся: маўляў, чаму школу не наведваеце? Па добраўпарадкаванні тэрыторыі таксама ў нас былі пытанні да іх — яны не прывыклі да таго, што для нас даўно стала нормай жыцця. Кажу: «Вы павінны скошваць пустазелле, на зямлі садзіць гародніну». Яны нават спачатку збіраліся ад'язджаць адсюль, а потым усё ж паабвыкліся і сталі выконваць тое, што мы патрабуем.

У аграгарадку Жгунь ёсць і газ, і водаправод, і каналізацыя. Вялікая крама, сярэдняя школа, новы дзіцячы сад. Дамы будуюцца. І да абласнога цэнтра рукой падаць — 20 км усяго. Для тых, хто хоча працаваць і жыць па-людску, усе магчымыя ўмовы створаны. Сваю задачу кіраўнік сельсавета Валянціна Кірыенка бачыць у тым, каб людзей арганізоўваць — падтрымліваць у належным выглядзе тое, што ўжо створана. Ну і самае галоўнае — жыць у ладзе, дапамагаць адзін аднаму. А калі што не так — у агляднай камісіі «вачэй» шмат. І метадаў, каб уздзейнічаць на нядбайных, таксама хапае.

**Фота аўтара.**

(Заканчэнне)

### Палажэнне аб старэйшынах населеных пунктаў

**Старэйшына мае права:**

* удзельнічаць у пасяджэнні і ўносіць на разгляд сельскага Савета дэпутатаў, выканкама, арганізацый прапановы па пытаннях, якія закранаюць інтарэсы насельніцтва адпаведнай тэрыторыі;

* заслухоўваць тлумачэнні і прымаць меры грамадскага ўздзеяння да асоб, якія дапусцілі парушэнні грамадскага парадку, шляхам абмеркавання іх дзеянняў на сходах грамадзян;

* здзяйсняць грамадскі кантроль за выкананнем правілаў забудовы, утрыманнем жылых дамоў і прыдамавых тэрыторый, захаваннем правілаў пажарнай бяспекі і санітарных нормаў, за рацыянальным выкарыстаннем зямлі, станам аховы прыроды, помнікаў гісторыі і культуры;

* звяртацца да кіраўнікоў працоўных калектываў і іх падраздзяленняў па садзейнічанне ў правядзенні мерапрыемстваў, якія датычацца добраўпарадкавання населеных пунктаў, а таксама дапамогі грамадзянам;

* выдаваць пісьмовыя прадпісанні грамадзянам, кіраўнікам арганізацый усіх формаў уласнасці па выкараненні парушэнняў правілаў добраўпарадкавання, санітарнага парадку, пажарнай бяспекі і іншых пытанняў.

...Прадпісанні і ўказанні старэйшыны, прынятыя ім у межах сваіх паўнамоцтваў, абавязковыя для выканання ўсімі арганізацыямі, размешчанымі на адпаведнай тэрыторыі, службовымі асобамі і грамадзянамі. У выпадку невыканання старэйшына мае права звярнуцца ў сельвыканкам з прапановай аб прыцягненні да адказнасці вінаватых асоб.

...Выкананне сваіх абавязкаў старэйшына здзяйсняе на грамадскіх пачатках. За дасягненне вынікаў у працы ён можа атрымаць заахвочвальныя выплаты, прэміі, узнагароды выканаўчых і распарадчых органаў улады.

# ЯК АПТЫМІЗАВАЦЬ БІБЛІЯТЭЧНУЮ СЕТКУ?

**Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці прааналізаваў работу бібліятэчнай сеткі ў Ваўкавыскім, Мастоўскім, Слонімскім і Смаргонскім раёнах.**

Аналіз паказаў, што практычна ў кожным населеным пункце (аграгарадку) ёсць публічныя сельскія бібліятэкі і бібліятэкі ўстаноў адукацыі. Напрыклад, у Ваўкавыскім раёне дзейнічае 21 публічная сельская бібліятэка і ўсюды, за выключэннем 6 населеных пунктаў, ёсць школьныя бібліятэкі. Такая ж сітуацыя ў Мастоўскім, Слонімскім і Смаргонскім раёнах. Пры гэтым асобныя фонды школьнай і публічнай бібліятэк размешчаны ў адным памяшканні, абслугоўванне чытачоў праводзяць адначасова два бібліятэкары ад устаноў адукацыі і культуры. Увогуле ў сельскай мясцовасці колькасць чытачоў бібліятэк пастаянна скарачаецца, і ў той жа час школы ў аграгарадках маюць свабодныя плошчы для размяшчэння бібліятэчных фондаў сельскіх бібліятэк.

Камітэт дзяржкантролю лічыць, што аптымізацыя сельскай бібліятэчнай сеткі дазволіць істотна знізіць затраты бюджэту вобласці. У Гродзенскі аблвыканкам накіравана інфармацыя з прапановай аб стварэнні інтэграванай сістэмы бібліятэчнага абслугоўвання сельскіх жыхароў, каб арганізаваць у населеным пункце для людзей рознага ўзросту адзіны бібліятэчны фонд і забяспечыць доступ да інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

МЯСЦОВЫ ЧАС

# ПАРАДАК НА МОГІЛКАХ: калі захацець, можна навесці

**Зімой давялося пісаць аб прыватнай гаспадарцы Мікалая Мікіцюка, які жыве на хутары паміж Азятамі і Старым Сялом у Жабінкаўскім раёне. Тады гаспадар між іншым сказаў, што ў іх сельсавеце могілкі — самыя дагледжаныя ва ўсім раёне. І, на яго думку, у гэтым заслуга старшыні сельскага Савета Ганны Шкарупы. Тым разам і занатавала сабе ў блакноце, што абавязкова трэба вярнуцца да гэтай тэмы і распытаць, якім чынам вырашаецца вельмі важнае, а для многіх актуальнае, нават балючае, пытанне.**

На тэрыторыі сельсавета знаходзяцца два месцы апошняга спачыну людзей — на цэнтральнай сядзібе, у Азятах, і ў іншым населеным пункце — Старое Сяло. І ў абедзвюх вёсках яны маюць вельмі дагледжаны выгляд. Роўная, акуратна пафарбаваная агароджа, выкашаная трава, адсутнасць смецця гавораць за тое, што пра парадак тут клапоцяцца пастаянна.

— Калі нехта не быў тут тры-чатыры гады, то вельмі здзіўляецца пераменам, якія адбыліся, — гаворыць старшыня сельскага Савета Ганна Шкарупа. — Менавіта чатыры гады таму мы шчыльна ўзяліся за добраўпарадкаванне сваіх могілак. Спачатку ўзвялі бетонную агароджу вакол. Гэту работу прафінансаваў, а таксама дапамог з рабочай сілай раённы Цэнтр занятасці. Калі плот быў пастаўлены і ўмацаваны, фарбаваць яго прыйшлі вяскоўцы. Многае зрабілі жыхары вёсак сваімі рукамі. Вычышчалі, прыбіралі могілкі. Быў час, што суботнікі праводзілі ледзь не кожны тыдзень. І людзі ў асноўным адклікаліся, ставіліся з разуменнем.

Ганна Васільеўна заўважыла, што грошай вясковая грамада не збірала, сродкі знаходзіла мясцовая ўлада. Але без працоўнага ўдзелу вяскоўцаў наўрад ці ўдалося б зрабіць так, як яно ёсць сёння. Такія людзі, як, напрыклад, Мікалай Здаравец, заслугоўваюць падзякі ўсіх аднавяскоўцаў. Вадзіцель мясцовага сельгаспрадпрыемства, выхадзец са шматдзетнай сям'і, навёў парадак не толькі там, дзе знайшлі спачын яго родныя. З уласнай бензапілой Мікалай Мікалаевіч зрабіў велізарную работу нават на суседніх старасельскіх могілках, не кажучы ўжо пра Азяты. Побач шчыраваў і Мікалай Галавачук. Жыхар вёскі Азяты Мікалай Андрасюк дапамагаў сваёй тэхнікай, бо мае на падворку трактар. Варта адзначыць і ўдзел старастаў вёсак. Адным словам, людзей найперш трэба было арганізаваць, расставіць, забяспечыць узаемадзеянне. А гэта Ганна Васільеўна ўмее. Потым ужо сусед глядзеў на суседа, і кожнаму няёмка было адседжвацца ў хаце. Аб адным шкадуе старшыня сельсавета: не ўдалося сагітаваць на ўдзел гарадскіх сваякоў. Многія дзеці і ўнукі лічаць сваім абавязкам прыязджаць толькі ў памінальныя дні. Але ж і ім цяпер прыемна наведваць памерлых на чыстых і акуратных могілках...

Калі ж узяліся за работу, то справай гонару было давесці яе да канца. Галоўная праблема, якая паўстала пасля таго, як ачысцілі, агарадзілі месца спачыну, — неабходнасць знесці дрэвы. Зразумела, што дрэвам на могілках не месца. З іх, асабліва сасновых, пастаянна абсыпаецца ігліца, ды і лісце засмечвае пахаванні, ускладняе догляд. Акрамя таго, старыя дрэвы, нават іх галіны, у буру ці навальніцу ўяўляюць сабой пагрозу для помнікаў, надмагільных збудаванняў. Таму іх адназначна вырашылі зносіць. А гэта 150 штук у Старым Сяле і каля 200 у Азятах. Для пачатку праз Цэнтр занятасці знайшлі чалавека, які мае дазвол на такую работу і пэўны досвед. Ён з дапамогай іншых мужчын пілаваў часткамі кожную сасну і бярэзіну. Гэтым займаліся два гады. Але работа была зроблена. Ды не ўся. Спілаванае дрэва трэба падзяліць на часткі, падняць, вывезці. Тут ужо не абыдзешся без спецыяльнай тэхнікі. І такой тэхнікай працаўнікоў забяспечыла прыватнае ўнітарнае аграрнае прадпрыемства «Азяты», за што старшыня Савета вельмі ўдзячна яго кіраўніку Сяргею Шыку. Сяргей Сцяпанавіч увесь час дапамагаў у справе давядзення да ладу могілак. І цяпер раз на квартал, а перад вялікімі святамі і значна часцей пагрузчык выбірае ўсё смецце, а трактар адвозіць яго на звалку. Такой тэхнікі, як няцяжка здагадацца, у сельскай улады няма. Дарэчы, месцы для складавання спецыфічнага смецця на кожных могілках спецыяльна адгароджаны. І людзі вельмі адказна і акуратна ставяцца да прыборкі. Вядома, самі ж стварылі парадак, самі стараюцца яго і падтрымліваць.

А ў цэлым падтрымліваць у належным стане могілкі няпроста. Калі прыбралі ўсе дрэвы, палез дробны хмызняк. Яго аднойчы палівалі гербіцыдам. Прайшоў год-другі, і непажаданая расліннасць зноў ўздымаецца... Пастаянна трэба абкошваць тэрыторыю, на што ў сельвыканкама не заўсёды хапае сродкаў і магчымасцяў. Ды зноў жа неяк выкручваюцца. Бо нідзе няма мясціны, якая зарасла б бур'яном ці хоць бы травой па калена.

Дырэктар Жабінкаўскага раённага Цэнтра занятасці насельніцтва Галіна Велінец сказала карэспандэнту «МС», што яны даўно працуюць з сельсаветамі па навядзенні парадку на могілках. І механізм арганізацыі працы, фінансавання адладжаны. Спачатку мясцовыя органы ўлады падаюць заяўку на тыя ці іншыя работы, каштарыс расходаў. Гэтыя дакументы адпаведным чынам узгадняюцца, выносяцца на разгляд райвыканкама, і пасля прыняцця рашэння фонд сацыяльнай абароны выдаткоўвае сродкі. Цэнтр занятасці ў сваю чаргу накіроўвае людзей, якія стаяць на ўліку як беспрацоўныя, фінансуецца іх зарплата, а таксама кошт матэрыялаў. Потым цэнтру толькі застаецца праверыць мэтавы расход сродкаў. І ў гэтым сэнсе да Азятаў ніколі не было прэтэнзій.

Галіна Велінец заўважыла, што такім чынам могуць працаваць усе сельсаветы раёна. Проста старшыня Азяцкага сельвыканкама праяўляе большую актыўнасць, настойлівасць, таму і мае адпаведныя вынікі.

А Ганна Шкарупа ў сваю чаргу дапоўніла, што наўрад ці ўдалося б выканаць такі вялікі аб'ём работы, каб не разуменне з боку райвыканкама. Калі яна мела дакладны план і ішла прасіць грошы на яго фінансаванне, то адмовы не сустракала ні разу. Тым больш што гаворка ідзе аб такой патрэбнай, нават высакароднай справе, як утрыманне могілак.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Жабінкаўскі раён.*

*У другой палове 2010 года Брэсцкі аблвыканкам прыняў рашэнне аб паэтапнай перадачы ўсіх сельскіх могілак на баланс раённых арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Рашэнне прадугледжвае правесці работу на працягу 2011-2012 гадоў. Пакуль што справа прасоўваецца павольна, як заўсёды, з-за недахопу сродкаў. Але кампанія гэта не вельмі простая і для сельсаветаў. Патрэбны акт на зямлю, іншыя дакументы, якія каштуюць грошай. Таму, паводле слоў Ганны Шкарупы, перадача могілак Азяцкага сельсавета адбудзецца не раней за кастрычнік-лістапад. Але перададуць яны свае аб'екты раённым камунальнікам у поўным парадку.*

ПАД ЗНОС

# БАЦЬКОЎСКАЯ СЯДЗІБА: памяць ці непатрэбны хлам?

**Дом жыве да таго часу, пакуль у ім жывуць людзі — нібы жывая істота, ён любіць дбайны догляд. А як толькі пра яго перастаюць клапаціцца, прыходзіць у заняпад.**

На жаль, ёсць такія спадчыннікі, якія гадамі не з'яўляюцца на родным падворку. Тым часам пад уздзеяннем кліматычных умоў пабудовы гніюць, трухлеюць, двары зарастаюць бур'яном. А калі, нарэшце, і ўспомняць дзеткі пра радавое гняздо, то надта здзіўляюцца: як гэта прыгожая калісьці пабудова ператварылася ў развалюху? Здараецца, што некаторыя спрабуюць абвінаваціць мясцовыя ўлады: маўляў, чаму не папярэдзілі, мы б не давялі сядзібу да такога стану.

— Як прымусіць спадчыннікаў даглядаць дом пасля смерці гаспадароў? Ці ёсць нейкія спосабы ўздзеяння на іх? — цікаўлюся ў галоўнага спецыяліста Старадарожскага раённага Савета дэпутатаў Зінаіды Караленi.

— Так, штрафы прадугледжаны, але яны, хутчэй, дзейнічаюць на паперы. Бо перш чым спагнаць грошы, трэба знайсці спадчыннікаў, — тлумачыць Зінаіда Караленя.

Зрабіць гэта нялёгка, бо жывуць яны не толькі ў Беларусі, але і за межамі краіны — прынамсі, многія ў Расіі. Разам з тым, сельвыканкамы прыкладаюць усе намаганні, каб адшукаць дзяцей, сваякоў, прымусіць упарадкаваць дом і ўчастак. А калі яны нязгодныя — адмовіцца ад пустуючага, занядбанага жылля, якое толькі псуе агульны выгляд вёскі. Паводле дзеючага заканадаўства, без пісьмовай згоды спадчыннікаў знесці такія развалюхі нельга.

—- А па рашэнні суда не спрабавалі гэта рабіць? — цікаўлюся ў суразмоўцы.

— Каб падрыхтаваць дакументы ў суд, выканкам павінен абследаваць збудаванне. А для гэтага неабходна стварыць камісію з прадстаўнікоў адпаведных службаў і пасля пэўнага вердыкту накіраваць пакет дакументаў у суд. У нас такіх грошай няма. Пра што казаць, калі не ўсе старшыні сельскіх Саветаў маюць нармальны службовы транспарт. Хтосьці карыстаецца зусім старым, дабітым аўтамабілем або вырашае грамадскія пытанні на асабістым аўто.

Усяго ж сёлета для зносу 188 пустуючых і трухлявых пабудоў раёну выдаткавана 182 млн рублёў, або 932 тыс. на «адзінку». Мала гэта ці многа? Зрэшты, усё пазнаецца ў параўнанні. Напрыклад, ёсць рэгіёны, якім на гэтыя мэты выдаткоўваюць усяго 5 мільёнаў. План па зносе пабудоў «зверху» не даводзіцца. Штогод на ўзроўні райсавета і на пярвічным узроўні зацвярджаюцца мерапрыемствы па добраўпарадкаванні сельскіх населеных пунктаў.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Зыходзячы з гэтага, кожны старшыня яшчэ раз правярае, дзе ў яго праблемныя месцы, і пачынае шукаць дзяцей, сваякоў, дасылае ім пісьмы, просіць, каб прыехалі, уступілі ў спадчынныя правы, каб або даглядалі сядзібу, або напісалі адмову. Зрэшты, знос дамоў — справа клопатная. Прынамсі, трэба наняць брыгаду работнікаў, тэхніку ў пабочных арганізацыях, паколькі ў сельвыканкама няма ні рабочых рук, ні машын, ні трактароў, ні бульдозераў.

— У нашым сельсавеце шэсць вёсак, у якіх пражывае 1400 чалавек, амаль палова з іх — 600 — у Залужжы. На другім месцы — Дражна. У астатніх засталося па 8-10 жыхароў, як правіла, пенсіянеры, — распавёў старшыня Дражнаўскага сельскага Савета Міхаіл Казлоў. — У вёсцы Карыцішча 4 сядзібы пад дачы купілі нават расіяне. Летам яны тут жывуць і займаюцца агародніцтвам, падсобнай гаспадаркай. Знаходзяць час, каб і зімой сюды завітаць. Старадарожчына прыцягвае расіян прыгожай прыродай, лесам, чыстай экалогіяй.

Вось бы так ставіліся да роднага падворка ўсе спадчыннікі, тады б мясцовая ўлада не мела клопату. Сустракаюцца, прынамсі, і такія, хто не дае згоды на знос. Але, разам з тым, і не хоча падтрымліваць парадак. Такія пабудовы можна выстаўляць на продаж. Толькі вось і тут затрат дастаткова. Па-першае, каб зрабіць гэта, неабходна падрыхтаваць дакументацыю, тэхнічны пашпарт, заплаціць землеўпарадкавальнай службе...

У Дражнаўскім сельсавеце ў 2009 і 2010 гадах знесена адпаведна 32 і 8 струхнелых і пустуючых дамоў, на якія затрачана больш за 9 і 4 мільёны рублёў. У 2011-м знесена 8, на адны пайшло 900 тысяч, на іншыя — менш. Усе залежала ад памераў пабудовы, яе стану. Усяго ж пададзена заяў на знос 83 дамоў. З 1 верасня ўступае ў сілу Указ Прэзідэнта Беларусі № 100 ад 23.02.2012 года «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і трухлявых дамоў у сельскай мясцовасці». На думку Міхаіла Казлова, гэты дакумент павінен аблегчыць і паскорыць працэс. Дом з гаспадарчымі пабудовамі ці без іх можна будзе прызнаць трухлявым, калі тут ніхто не пражывае на працягу года і не заяўлены ўладальнік, а тыя, хто мае права ім карыстацца, не робяць спроб да яго аднаўлення. Пад пустуючымі разумеюцца дамы, дзе на працягу апошніх трох гадоў асобы, якія маюць права карыстання імі, пражывалі ў агульнай колькасці менш за адзін месяц каляндарнага года. А таксама тады, калі яны не прадставілі пісьмовыя звесткі пра тое, што маюць намер тут жыць. Па-ранейшаму з 1 верасня мясцовыя органы ўлады будуць весці рэгістр уліку пустуючых дамоў для таго, каб на працягу месяца падаць іск у суд аб прызнанні іх безгаспадарнымі. Раней для гэтага адводзілася 6 месяцаў. Магчыма, новы дакумент стане стымулам для нядобрасумленных спадчыннікаў, паставіць іх перад выбарам — адмовіцца ад дома ці падтрымліваць тут парадак. А ў сельвыканкамаў выслабаняцца час і сродкі, што трацяцца на пошук сваякоў і касьбу пустазелля на прысядзібных участках. У сельскіх уладаў, акрамя гэтага, шмат іншых клопатаў па добраўпарадкаванні. Старшыня сельскага Савета ў адной асобе і кіраўнік, і гаспадарнік, і фінансавы дырэктар. Напрыклад, на тэрыторыі Дражнаўскага сельсавета ёсць старыя могілкі, дзе пачалі сохнуць дрэвы. Міхаіл Фядосавіч узяў чалавека ў мясцовым лясніцтве, каб іх спілаваць. Зараз нанятыя ім людзі ўстанаўліваюць і фарбуюць штыкетнік у дварах мясцовых жыхароў. Нядаўна ў вёсцы Дражна зманціравалі ёмістасць для захоўвання вады. «У нас здараюцца пажары, асабліва тады, калі пачынаецца ацяпляльны сезон, а прыроднага ці штучнага вадаёма тут няма», — растлумачыў старшыня.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*Старадарожскі раён.*

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

**Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 30.015. Нумар падпісаны ў 19.30 26 чэрвеня 2012 года.**

# ЯК АЦАНІЦЬ ДЗЕЙНАСЦЬ ШКОЛЫ АБО ВНУ?

## У ГАЛОЎНЫМ АДУКАЦЫЙНЫМ ВЕДАМСТВЕ ВЫЗНАЧЫЛІСЯ З КРЫТЭРЫЯМІ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ІХ РАБОТЫ

**Міністэрства адукацыі агучыла крытэрыі і паказчыкі дзейнасці ўстаноў адукацыі, якія рэкамендавана выкарыстоўваць мясцовым органам кіравання адукацыяй пры ацэнцы эфектыўнасці дзейнасці ўстаноў адукацыі за 2012 год. Крытэрыі ахопліваюць усе ўзроўні адукацыі — дашкольную, агульную сярэднюю, спецыяльную, сярэднюю спецыяльную, прафесійна-тэхнічную, вышэйшую і дадатковую адукацыю.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Немалаважна, што распрацаваныя ў галоўным адукацыйным ведамстве крытэрыі ўключаюць не толькі звесткі статыстычнай справаздачнасці, але і ацэнку дзейнасці ўстановы адукацыі спажыўцамі адукацыйных паслуг.

Напрыклад, у дачыненні да ўстаноў дашкольнай адукацыі будуць брацца пад увагу такія крытэрыі, як паказчык забяспечанасці кадрамі і цякучасць педагагічных кадраў, узровень кваліфікацыі педагогаў; забяспечанасць сродкамі выхавання і навучання, вучэбна-нагляднымі дапаможнікамі, гульнявым абсталяваннем, спартыўным рыштункам, электроннымі сродкамі навучання; выкананне натуральных нормаў харчавання. У графе «эканамічныя вынікі» фігуруюць выдаткі на навучанне і ўтрыманне аднаго дзіцяці (для дзяржавы і для бацькоў), а таксама выкананне паказчыка па энергазберажэнні. Раз у год сярод бацькоў будзе праводзіцца анкетаванне з мэтай высветліць ступень задаволенасці бацькоў якасцю адукацыі сваіх дзяцей. Будуць ацэньвацца таксама стан здароўя выхаванцаў (ці не пагоршыўся ён за час іх знаходжання ва ўстанове адукацыі), паказчык захваральнасці і колькасць выпадкаў траўматызму сярод дзяцей.

**«Пад увагу будуць брацца толькі вынікі выпускнікоў гэтага года, якія на ЦТ атрымаюць бал, вышэйшы за сярэдні бал па краіне»**

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ступень задаволенасці бацькоў якасцю адукацыі таксама будзе ацэньвацца з дапамогай анкетавання (адзін раз у год). Але пад увагу будуць брацца і шмат іншых важных нюансаў — такіх, напрыклад, як напаўняльнасць класаў, працэнт навучэнцаў, якія наведваюць факультатыўныя заняткі, працэнт вучняў, уцягнутых у мерапрыемствы шостага школьнага дня, колькасць выпускнікоў 9-х і 11-х класаў, якія нідзе не навучаюцца і не працуюць, працэнт навучэнцаў, якія знаходзяцца на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх, колькасць зафіксаваных парушэнняў правілаў унутранага распарадку (пропускі заняткаў, факты курэння і г.д.), колькасць пропускаў вучэбных заняткаў па прычыне хваробы, паказчык траўматызму сярод навучэнцаў. Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што ацэньвацца будуць не толькі паводзіны вучняў, але і паводзіны работнікаў установы адукацыі: дапушчаныя імі правапарушэнні ці парушэнні правілаў унутранага распарадку (факты курэння на тэрыторыі навучальнай установы, спажывання спіртных напіткаў і гэтак далей).

Але самае цікавае, безумоўна, хаваецца за крытэрыем «якасць адукацыі». Агульнавядома, што педагогі выпускных класаў як агню баяцца вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання, баяцца, каб іх не пакаралі за тое, што іх вучні апынуліся ў самым нізе абітурыенцкага рэйтынгу. Магчыма, цяпер яны змогуць уздыхнуць з палёгкай? Ва ўсялякім разе афіцыйна пад увагу будуць брацца толькі вынікі выпускнікоў гэтага года, якія на ЦТ атрымаюць бал, вышэйшы за сярэдні бал па краіне. Аргументам на карысць якасці адукацыі будзе таксама наяўнасць сярод выхаванцаў установы адукацыі ўдзельнікаў абласнога і рэспубліканскага тураў школьных алімпіяд, інтэлектуальных, спартыўных і творчых конкурсаў і турніраў. А вось паспяховасць дзевяцікласнікаў будзе ацэньвацца крыху іншым чынам: будзе падлічвацца працэнт навучэнцаў дзявятых класаў, якія маюць сярэдні бал паспяховасці 6 і ніжэй і прадоўжылі навучанне ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

У сістэме прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі галоўнымі «экспертамі» па якасці адукацыі стануць як працадаўцы (задаволеныя ці незадаволеныя якасцю падрыхтоўкі маладых спецыялістаў), так і самі выпускнікі, якія будуць даваць ацэнку якасці вучэбных праграм і якасці выкладання.

**«Улічвацца будзе працэнт навучэнцаў, якія наведваюць факультатыўныя заняткі, працэнт вучняў, уцягнутых у мерапрыемствы шостага школьнага дня, колькасць пропускаў вучэбных заняткаў, паказчык траўматызму сярод навучэнцаў»**

У вышэйшай школе адным з індыкатараў ацэнкі эфектыўнасці работы будзе лічыцца працэнт выпускнікоў першай ступені адукацыі, якія здалі выніковую атэстацыю з адзнакамі 9 і 10 балаў, і працэнт аспірантаў (дактарантаў), якія абаранілі дысертацыі ў адведзены тэрмін або закончылі навучанне з праходжаннем папярэдняй экспертызы дысертацыі.

**Міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ** спадзяецца, што зацверджаныя крытэрыі не толькі адлюстроўваюць сучасныя патрабаванні грамадства да дзейнасці навучальных устаноў, але і будуць стымуляваць развіццё ўстаноў адукацыі. Ва ўсялякім разе цяпер усім кіраўнікам вядомыя арыенціры, на якія трэба нацэльваць педагагічныя калектывы. З іншага боку, і ВНУ, каб павысіць свой рэйтынг, магчыма, будуць больш клапаціцца пра сваю «бачнасць» у інтэрнэт-прасторы і прысутнасць у міжнародных рэйтынгах, пра колькасць публікацый сваіх выкладчыкаў у навуковых выданнях і пераход да выкладання вучэбных дысцыплін на замежных мовах, пра стажыроўкі выкладчыкаў за мяжой і ўдзел у міжнародных акадэмічных праграмах абмену. Вельмі важна, што **за многія паказчыкі адказнасць разам з кіраўнікамі ўстаноў адукацыі будуць несці і кіраўнікі мясцовых органаў кіравання адукацыяй** — напрыклад, за кадравае забеспячэнне ўстаноў адукацыі, іх матэрыяльна-тэхнічную базу, наяўнасць камп'ютараў з шырокапалосным доступам у інтэрнэт і нават за рэгулярнае абнаўленне інтэрнэт-сайта ўстановы адукацыі.

Зараз ужо распачалася работа па стварэнні агульнай электроннай базы аб дзейнасці ўстаноў адукацыі і органаў кіравання адукацыяй на падставе распрацаваных крытэрыяў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АЧЫШЧАЛЬНЫЯ ЗБУДАВАННІ... УЯЎЛЯЮЦЬ ПАГРОЗУ

## ЦІ ЭФЕКТЫЎНА НА ВІЦЕБШЧЫНЕ, ЯКАЯ ЗАЙМАЕ ПЕРШАЕ МЕСЦА Ў РЭСПУБЛІЦЫ ПА ЗАПАСАХ ВОДНЫХ РЭСУРСАЎ, ПРАЦУЮЦЬ КАМУНАЛЬНЫЯ ЗБУДАВАННІ ПА АЧЫСТЦЫ СЦЁКАВЫХ ВОДАЎ?

**Нагадаю, што ў Віцебскай вобласці будаўніцтва і рэканструкцыя ачышчальных збудаванняў ажыццяўляецца ў рамках адпаведнай праграмы «Чыстая вада», рэалізацыі абласных мерапрыемстваў па рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў і ахове навакольнага асяроддзя на 2011—2015 гады.**

### Даведка «Звязды»

*У вобласці сёння налічваецца 93 збудаванні па ачыстцы сцёкавых водаў, якія знаходзяцца на балансе ў 28 прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі.*

*І калі ў здавальняючым тэхнічным стане знаходзяцца ачышчальныя збудаванні ў Браславе, Лепелі, Оршы, Паставах, Талачыне, Шаркаўшчыне, Бароўцы Лепельскага раёна, вёсцы Параф'янава Докшыцкага раёна, дык у многіх іншых населеных пунктах існуюць праблемы, звязаныя з ачысткай сцёкавых водаў і станам водных аб'ектаў.*

Ачышчальныя збудаванні ў Верхнядзвінску, Докшыцах, Дуброўна размяшчаюцца ў водаахоўных зонах, а таму ўяўляюць пагрозу, з'яўляюцца патэнцыйнымі крыніцамі забруджвання падземных і паверхневых водаў. Адвядзенне сцёкавых водаў у азёры адмоўна ўплывае на вадаёмы. У прыватнасці, зніжаецца празрыстасць вады Сенненскага возера, у летні час вада мяняе колер, ідзе зарастанне паверхні.

Складаная абстаноўка па ачыстцы сцёкавых водаў склалася ў Глыбокім, дзе адсутнічаюць гарадскія ачышчальныя збудаванні, а камунальныя сцёкавыя воды ачышчаюцца ў асноўным на маральна і фізічна састарэлых збудаваннях прадпрыемстваў ААТ «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат», «Глыбоцкі аграсэрвіс», «Глыбоцкі кансервавы завод» і іншых. Ачышчальныя будынкі гэтых прадпрыемстваў эксплуатуюцца больш за 20 гадоў.

— Неспрыяльная сітуацыя склалася і ў сельскіх населеных пунктах, бо тэхнічны стан пасялковых ачышчальных збудаванняў нездавальняючы ў цэлым. На гэта ў зваротах скардзіліся і грамадзяне. У прыватнасці, летась і пазалетась сістэматычна паступалі скаргі ад жыхароў вёсак Заронава, Бабінічы і Бялынавічы Віцебскага раёна. І іх «сігналы» пацвярджаліся, — расказвае **Таццяна Брылеўская, начальнік аддзела дзяржкантролю за аховай і выкарыстаннем атмасфернага паветра і водных рэсурсаў Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.** — Летась з-за парушэнняў правілаў эксплуатацыі каналізацыйных сетак адбылося забруджванне возера Заронава. Гаспадарча-бытавыя сцёкі ад жылых дамоў праз прабоіну каналізацыйнага калодзежа скідваліся на зямлю і далей у гэтае возера.

У вёсцы Бялынавічы ачышчальныя збудаванні таксама знаходзяцца ў нездавальняючым стане.

З-за засмечанасці пяском каналізацыйных сетак у вёсцы Бабінічы сцёкі ад жылых дамоў скідаюцца ў меліярацыйны канал і далей у раку Віцьба. Пасялковыя ачышчальныя збудаванні механічнай ачысткі і каналізацыйная помпавая станцыя знаходзяцца ў нездавальняючым стане...

Вялікі працэнт зношанасці каналізацыйных сетак і неналежныя ўмовы эксплуатацыі аб'ектаў водаадвядзення прыводзяць да аварыйных сітуацый. Напрыклад, сёлета выяўлены факт аварыйнага скідвання гаспадарча-фекальных сцёкаў з каналізацыйнага калектара КУП «Райжылфонд» у вадасховішча на рацэ ў вёсцы Межава Аршанскага раёна.

Эколагі адзначаюць недахоп спецыялістаў або адсутнасць неабходнай кваліфікацыі ў персаналу, які абслугоўвае ачышчальныя збудаванні, напрыклад, у Докшыцах, Шаркаўшчыне, Расонах.

Лабараторны кантроль за працай ачышчальных збудаванняў уласнымі лабараторыямі ажыццяўляецца не на ўсіх прадпрыемствах ЖКГ, а толькі на васьмі. Астатнія прадпрыемствы праводзяць такі кантроль перыядычна ў межах дагаворных адносін. А гэта не дазваляе ў поўнай меры ацаніць эфектыўнасць работы ачышчальных збудаванняў, пракантраляваць працэс ачысткі сцёкавых водаў да патрэбных параметраў.

Віцебскім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя толькі летась былі выяўлены каля 50 парушэнняў нарматываў якасці сцёкавых водаў. Дарэчы, штогод гэты паказчык памяншаецца. Для параўнання, у 2006 годзе выявілі 93 парушэнні. Па выніках мінулага года да 14 прадпрыемстваў Мінжылкамгаса прымянілі штрафныя санкцыі на агульную суму звыш 21 мільёна рублёў. Для пакрыцця шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю парушэннем воднага заканадаўства, прад'яўлена 29 прэтэнзій на суму больш за 439 мільёнаў рублёў.

Сёлета ўжо на 7 прадпрыемствах былі парушаны ўмовы адвядзення сцёкавых водаў у водныя аб'екты. І зноў «засвяціліся» некаторыя злосныя парушальнікі. Выяўлена 11 выпадкаў перавышэнняў нарматываў, складзена 7 пратаколаў на суму больш за 3 мільёны рублёў, прад'яўлена 4 прэтэнзіі на суму каля 20,7 мільёна рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Орша — Віцебск.*

### ПАПЛЫЎ НА ВОСТРАЎ...

**У Брэсце мужчына пасварыўся з дзяўчынай і вырашаў паплыць на востраў. Вярнуцца назад яму дапамаглі выратавальнікі.**

— Паведамленне пра тое, што з цэнтральнага пляжа горада па вуліцы Набярэжнай у бок вострава паплыў мужчына і знік з віду, паступіла ў цэнтр аператыўнага ўпраўлення Брэсцкага УМНС у 22.41. Справа ў тым, што на пляжы ёсць выратавальны пост АСВОД з графікам працы да 22 гадзін, — падзяліўся падрабязнасцямі здарэння старшы інспектар цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч. — Калі праз дзве хвіліны выратавальнікі прыбылі на месца, на паверхні вады нікога не было. Адлегласць да вострава — 100 метраў. Работнікі МНС у выратавальных камізэльках на лодцы дабраліся да вострава, дзе і знайшлі 31-гадовага жыхара Брэста. Высветлілася, што, будучы нападпітку і пасварыўшыся са сваёй дзяўчынай, мужчына вырашыў паплыць на востраў. У 23.15 яго даставілі на бераг і перадалі супрацоўнікам міліцыі. У медыцынскай дапамозе мужчына патрэбы не меў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### АЛІМЕНТШЧЫКА ЗАТРЫМАЛІ ПАГРАНІЧНІКІ

Полацкія пamежнікі і супрацоўнікі міліцыі ў адной з памежных вёсак Мёрскага раёна затрымалі злоснага аліментшчыка, ды яшчэ і злодзея. Жыхара Полацка шукалі за тое, што ён учыняў крадзяжы на ўсёй прасторы СНД. І, як высветлілася, у дадатак мужчына не выплачваў аліменты. Цяпер з ім «разбіраюцца» міліцыянеры. Тэрмін пазбаўлення волі «свеціць» яму немалы. А галоўнае, шкада дзяцей, якіх злодзей зрабіў сіротамі і пакінуў без матэрыяльнай дапамогі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ■ Крымінал, здарэнні

### За «халяўнае» будаўніцтва — тэрмін з канфіскацыяй

**Суд Ленінскага раёна г. Магілёва вынес прысуд былому намесніку старшыні Магілёўскага гарвыканкама і кіраўніку адной з будаўнічых арганізацый горада.**

Супрацоўнікі УКДБ па Магілёўскай вобласці выявілі факты выкарыстання былым намеснікам старшыні гарвыканкама службовага становішча ў карыслівых мэтах. Курыруючы згодна са службовымі абавязкамі работу будаўнічай галіны горада, чыноўнік вырашыў мінімізаваць затраты на будаўніцтва ўласнага прыватнага дома. Па «дапамогу» ён звярнуўся да дырэктара будаўнічай арганізацыі з просьбай прадаставіць спецтэхніку, грузавы аўтатранспарт, будматэрыялы і рабочых будспецыяльнасцяў без заключэння адпаведных дамоўленасцяў і аплаты. Дырэктар прадпрыемства арганізаваў з кастрычніка 2007-га па кастрычнік 2009 года работы па будаўніцтве прыватнага дома. У выніку прадпрыемства панесла страты ў буйным памеры.

Былому чыноўніку прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 3 гады з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых абавязкаў. Дырэктару будаўнічай арганізацыі суд вынес аналагічны прысуд з адтэрміноўкай яго выканання на 2 гады. Абвінавачаныя падалі касацыйныя скаргі ў абласны суд.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### Што яго прымусіла?

**У Полацкім раёне 16-гадовы вучань сярэдняй школы скончыў жыццё самагубствам — лёг на рэйкі перад лакаматывам. Трагедыя адбылася а дванаццатай гадзіне дня на 479 кіламетры чыгуначнага перагона Ксты-Фарынава.**

— Было ўстаноўлена, што падлетак незадоўга да трагедыі знаходзіўся на чыгуначнай станцыі Фарынава і блукаў уздоўж чыгуначных пуцей. Калі ён убачыў цягнік, то спыніўся каля рэек. Машыніст таварняка, які рухаўся з Полацка ў Маладзечна, падумаў, што хлопец прапускае састаў. Аднак школьнік у апошні момант скокнуў на магістраль і лёг папярок рэек за некалькі метраў перад лакаматывам, — паведамілі ў Полацкім аддзеле ўнутраных спраў на транспарце. — Нягледзячы на тое, што машыніст зрабіў экстраннае тармажэнне, пазбегнуць наезду не ўдалося. Падлетак загінуў на месцы. Высветлілася, што хлопец рос і выхоўваўся ў паспяховай сям'і, з'яўляўся выдатнікам вучобы і ўдзельнічаў у розных школьных алімпіядах. Па гэтым факце працягваецца праверка.

### Валюту прадаў... міліцыянерам

**Ноччу на прывакзальнай плошчы каля аршанскага чыгуначнага вакзала падчас правядзення кантрольнай закупкі міліцыянеры затрымалі валютчыка.**

Апошні, нічога не падазраючы, абмяняў чарговаму кліенту 5 тысяч расійскіх рублёў на 1,2 мільёна беларускіх. І тут жа быў злоўлены — за руку. Высветлілася, што абменам валюты зарабляў сабе «на хлеб» непрацуючы мясцовы жыхар. Зразумела, незаконна, не маючы на тое спецыяльнага дазволу, чым парушаў усталяваны парадак правядзення валютных аперацый. У дачыненні да затрыманага быў складзены адміністрацыйны пратакол. Валюту канфіскуюць, а грамадзяніна аштрафуюць. Цікава, ці будзе ён зноў працягваць прыватную банкаўскую дзейнасць?

### Аршанскі «кветкавод»

У Оршы міліцыянеры знайшлі ў кватэры мясцовага жыхара вялікі ўраджай канапель. «Кветкавод» вырасціў каля 40 вельмі папулярных сярод наркаманаў раслін. Аддзелам Следчага камітэта заведзена крымінальная справа. Міліцэйская аперацыя «Мак» працягваецца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### Забіў у зоне спакою...

**Паблізу вёскі Ціхань Слуцкага раёна ў зоне спакою Слуцкага лясгаса егерская служба апошняга знайшла месца здабычы і разбору самкі дзіка.**

Па гэтай інфармацыі рэйдавыя групы Салігорскай і Любанскай міжрайінспекцый выйшлі на асобу, што мела дачыненне да незаконнага палявання. У браканьера канфіскавалі галаву і шкуру жывёлы. А на дачы падазронага ў вышэйназванай вёсцы Ціхань — незарэгістраваную паляўнічую стрэльбу ТОЗ-63, лямпу-фару саматужнай вытворчасці і іншыя рэчавыя доказы, што мелі дачыненне да справы. Слуцкі РАУС вырашае пытанне адносна крымінальнай адказнасці браканьера.

### Браканьер-«універсал»

**Работнікі Бягомльскай міжрайінспекцыі разам з супрацоўнікамі аператыўнага ўпраўлення Дзяржінспекцыі ў паляўнічых угоддзях Бягомльскага лясгаса затрымалі грамадзяніна, які незаконна здабыў дарослага дзіка.**

У парушальніка канфіскавалі незарэгістраваны паляўнічы карабін ІЖ-18МН калібру 7,62 міліметра, 15 патронаў да яго і дзічыну агульнай вагой 200 кілаграмаў. Міліцыя ўжо завяла крымінальную справу.

— А пры аглядзе аўтамабіля парушальніка была знойдзена прылада лоўлі, прынцып працы якой заснаваны на выкарыстанні электрамагнітнага поля, — паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. — У сувязі з гэтым на парушальніка склалі яшчэ два адміністрацыйныя пратаколы.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■


## ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Столы бильярдные в ассортименте и сопутствующие товары.** Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС **http://court.by/vitebsk/divestiture/, http://court.by/ sales/.** |
| Собственник (владелец) имущества | ЧУП «Кастигар», УНП 390528038 |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Новополоцк, ул. Парковая, 1 |
| Наличие обременений | отсутствуют |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | **С 9.00 20 июля 2012 года по 18.00 29 июля 2012 года** На интернет-портале хозяйственных судов Республики Беларусь http://court.by/sales/ |
| Справочная информация об организаторе торгов | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 321, **http://court.by/vitebsk/** Судебный исполнитель Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 49 13 49, (8 029) 663 53 24, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел.: (80212) 49 13 40, (8044) 746 73 00 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, в течение 15 дней со дня, следующего за днем размещения публичного извещения об электронных торгах на интернет-портале хозяйственных судов Республики Беларусь, обязано пройти регистрацию. Для регистрации на сайте лицо знакомится с порядком проведения торгов, дает подписку об отсутствии препятствий для участия в торгах в соответствии со статьей 384 ХПК, перечисляет задаток в размере 10 % от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670 не позднее 13.07.2012 и заполняет заявление. Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС http://court.by/vitebsk/divestiture/, http://court.by/ sales/. |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Оборудование (вакуумная пропитка, станок для хонингования, станок точильно-шлифовальный ТШ-2, литейные формы, приспособление для формовки лобовых частей, стабилизатор напряжения СТС2М, блок испытания витков К-540, печь электропромышленная СНОС-8.12.16/2,5-41, пресс пневматический ПЦВБ 16001, сварочный трансформатор ВДУ-506, сварочный преобразователь, литейные формы, верстаки металлические)** общей стоимостью 130 154 000 белорусских рублей. Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС **http://court.by/vitebsk/divestiture/** |
| Собственник (владелец) имущества | ООО «Завод электродвигателей «Элласт» |
| Местонахождение (адрес) имущества | Восточный Тракт, д. 2, г. Новолукомль, Чашникский район |
| Информация об обременениях | Арест хозяйственным судом Витебской области |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 316, **10 июля 2012 года в 11.00** |
| Справочная информация | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 316 **http:// vitebsk.court.by/** Судебный исполнитель Коржов Алексей Игоревич, тел./факс: (80212) 49 13 47, (8 029) 366 40 10. Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Не позднее 09.07.2012 внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома в Поставском районе Витебской области

УНП 300088286

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Дата, время, место проведения аукциона | **27 июля 2012 года в 10.00 в здании райисполкома (г. Поставы, пл. Ленина, 25, 3-й этаж, каб. 58)** | | | | |
| Адреса, площади, кадастровые номера земельных участков, начальная цена | Адрес участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма, подлежащая возмещению организатору аукциона, руб. |
| | Новоселковский сельсовет, д. Гавриловичи, ул. Приозерная, 5В | 0,2500 | 224084003601000060 | 10 000 000 | 4 569 122 |
